УДК 81.373.21(476)

***Н.А. БАГАМОЛЬНІКАВА***

# ЛЕКСІКА-СЕМАНТЫЧНЫЯ ТЫПЫ МАТЫВАЦЫІ ГАДОНІМАЎ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ

*Артыкул прысвечаны вывучэнню сучаснага стану урбанонімаў, у прыватнасці, гадонімаў Гомельшчыны ў лексіка-семантычным аспекце. Крыніцай даследавання з'яўляюцца найменні лінейных аб'ектаў абласнога горада, 20 раённых цэнтраў і іх буйных населеных пунктаў. Адзначана, што ў фарміраванні гаданіміі задзейнічаны два пласты лексікі: апелятыўная (9 тыпаў з іх унутранымі разнавіднасцямі) і анамастычная. Аданамастычныя ўтварэнні матывуюцца 7 класамі: антрапонімамі, айконімамі, ідэонімамі, гідронімамі, харонімамі, этнонімамі, якія фарміруюць новую группу ў даным класе онімаў. Выяўлены таксама тыпалогія і адрозненне ў найменні геаграфічных аб'ектаў, зроблены высновы аб прадуктыўнасці і ступені ўжывання прадметна-тэматычных груповак. Праведзены аналіз гадонімаў дапаўняе высновы па вывучэнні тапанімічнай лексікі адзначанага вышэй рэгіёна.*

Гадонімы – уласныя назвы лінейных аб'ектаў населеных пунктаў: плошчаў, бульвараў, праспектаў, набярэжных, вуліц, завулкаў, пераездаў – вывучае адзін з раздзелаў тапанімікі урбананіміка (ад лац. *urbanus* 'гарадскі' і *onyma* 'імя'). Урбанонімы, як і іншыя класы онімаў, з'яўляюцца важнай крыніцай вывучэння мінулага народаў, даюць магчымасць уявіць змест гістарычнага працэсу ў цэлым.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Першыя айчынныя працы па урбананіміцы былі прысвечаны найменням асобных гарадоў Расіі і рэспублік, што ўваходзілі ў склад былога СССР (50 – 60-я гг. XX ст.).

Беларуская урбананімія ўпершыню пачала вывучацца ў 70-я гг. Аб'ектам аналізу былі онімы г. Мінска [3], Віцебска [5]. Паглыбленае вывучэнне беларускай урбананіміі пачалося з 90-х гг. Г.М. Мезенка [6, 7, 8]. Аўтар прасачыла гісторыю фарміравання асноўных структурна-граматычных і семантычных тыпаў урбанонімаў і спосабы іх утварэння.

Гадонімам Гомеля таксама прысвечана некалькі артыкулаў, у якіх апісваюцца асобныя тэматычныя групы назваў цэнтральных лінейных аб'ектаў абласнога горада [2] (усіх жа іх – 644). Урбанонімы іншых населеных пунктаў Гомельскай вобласці, што маюць статус горада або гарадскога пасёлка (большасць з іх – раённыя цэнтры), а таксама буйных вёсак, да гэтага часу не даследаваны, таму наша ўвага скіравана на вывучэнне сучаснага стану адзначанага пласта лексікі Гомельшчыны на семантычным узроўні. Крыніцай даследавання з'яўляюцца найменні лінейных аб'ектаў абласнога горада, 20 раённых цэнтраў і іх вёсак (833 : 3235)*. Разгляд гадонімаў выкліканы неабходнасцю комплекснага аналізу тапанімічнай прасторы Гомельшчыны, бо вядома, што "імёны розных анімічных палёў цесна звязаны паміж сабой і залежаць адно ад аднаго, уяўляючы сабой сістэму" [7, с. 27]. Айканімія (сукупнасць уласных назваў населеных пунктаў) і гідранімія (сукупнасць уласных назваў водных аб'ектаў) даследуемай тэрыторыі разглядалася ў працах Р.М. Казловай, А.Ф. Рогалева, Н.А. Багамольнікавай, Т.М. Багаедавай. Тапанімічныя катэгорыі пры іх агульнасці маюць і адметнасці, таму разгляд іх паасобку дазваляе пераканаўча выявіць тыпалагічныя схемы намінацыі, прасачыць пэўныя заканамернасці ў называнні аб'ектаў, зрабіць вывады аб прадуктыўнасці-непрадуктыўнасці і ступені ўжывальнасці прадметна-тэматычных груповак. Даследаванні паказваюць, што найбольшая тыпалогія назіраецца паміж такімі класамі тапонімаў, як айконімы і гідронімы [1, 4]. У іх амаль аднолькавыя крыніцы паходжання і спосабы ўтварэння, такая ж разнастайнасць лексіка-тэматычных груп унутры онімаў. У гідраніміі намі выяўлена каля 30 тыпаў лексіка-семантычнай матывацыі [1]. Асобнае месца ў гэтых адносінах займае урбананімія. Напрыклад, у гаданіміі Масквы А.В. Суперанская выдзеліла ў залежнасці ад матывацыі 12 тыпаў [6, с. 5]. Аналіз гадонімаў Гомельшчыны дапоўніць вывады па вывучэнні тапанімічнай лексікі рэгіёна.

Фактычны матэрыял сведчыць, што значны пласт утвараюць у сістэме акрэсленых намінантаў гадонімы, матываваныя класамі анамастычнай лексікі: антрапонімамі, айконімамі, ідэонімамі, гідронімамі, харонімамі, этнонімамі, самімі урбанонімамі (545:1728).

Унутры першага тыпу матывацыі актыўна і прадуктыўна выступае макрагрупа, у намінацыі якой удзельнічаюць антрапонімы па формуле – матыў *у гонар знакамітых людзей* (399 : 1252). Гэта выклікана гістарычнымі падзеямі ў краіне (Кастрычніцкая рэвалюцыя, грамадзянская вайна, калектывізацыя, Вялікая Айчынная вайна, развіццё новых галін навукі, працэс масавых перайменаванняў і г. д.). Разнастайнасць найменняў, матываваных імёнамі, дазваляе выдзеліць, у сваю чаргу, падгрупы.

Фундаментам для першай падгрупы сталі прозвішчы , псеўданімы разнастайных палітычных і грамадскіх дзеячаў: а) пачынальнікаў ідэалогіі камунізма: вул. ***Леніна*** (63), ***К. Маркса*** (16), ***Ф. Энгельса*** (14); б) рускіх прафесійных рэвалю-

---

* Першая лічба ў дужках абазначае колькасць прааналізаваных найменняў, другая – колькасць абазначаных імі аб'ектаў.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

цыянераў: вул. ***Бабушкіна*** (2), ***Бакуніна*** (2), ***Баумана*** (2), ***Карповіча*** (3), ***Крапоткіна***, ***Пляханава*** (3); в) вядомых партыйных і савецкіх дзеячаў: вул. ***Арджанікідзе***, ***Варашылава*** (7), ***Дзяржынскага*** (19), ***Калініна*** (33), ***Кірава*** (28), ***Крупскай*** (7), ***Куйбышава*** (11), ***Лазо*** (12), ***Луначарскага*** (14), ***Свярдлова*** (18), ***Урыцкага*** (8), ***Фрунзе*** (17), ***Фурманава*** (3). Асобна выдзяляюцца тут нешматлікія гадонімы, у якіх увекавечана памяць аб вядомых беларускіх партыйных і савецкіх дзеячах: вул. ***Кісялёва*** (2), ***Мазурава***, ***Малаковіча***, ***Машэрава*** (2), ***Мяснікова*** (4), ***Прытыцкага*** (2), ***Сурганава***; г) дзеячаў міжнароднага рабочага руху: вул. ***Дзімітрава*** (3), ***К. Лібкнехта*** (3), ***Розы Люксембург*** (3), ***Тэльмана*** (8), ***Хо Шы Міна***, ***К. Цэткін***; д) першых савецкіх дыпламатаў: вул. ***Вароўскага*** (6), ***Войкава*** (6).

Другая падгрупа ўключае найменні, якія ўтварыліся на базе прозвішчаў удзельнікаў паўстанняў, рэвалюцый і войнаў: а) правадыроў паўстання рабоў, сялянскага руху, дзекабрыстаў, вядомых палкаводцаў, адміралаў прошлага часу: вул. ***Спартака*** (2), ***Б. Хмяльніцкага*** (5), ***Пугачова*** (2), ***С. Разіна***, ***Лапы*** (нарадзіўся ў мяст. Рудабелка, што на Гомельшчыне), ***Кутузава*** (5), ***Суворава*** (13), ***Нахімава*** (3); б) удзельнікаў грамадзянскай вайны: вул. ***Апанскага***, ***Будзённага*** (7), ***Жаркоўскага***, ***Катоўскага*** (10), ***Чапаева*** (29), ***Шчорса*** (9); в) удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны: савецкіх военачальнікаў, маршалаў, палкаводцаў: вул. ***Даватара*** (6), ***Жукава*** (5), ***Карбышава*** (3), ***Конева*** (2), ***Ракасоўскага*** (6), ***Тухачэўскага*** (5), ***Чарняхоўскага*** (2); удзельнікаў вызвалення Беларусі і Гомельшчыны: вул. ***Антошкіна***, ***Валенціка***, ***Ватуціна*** (2), ***Волкава*** (8), ***Гарбатава*** (2), ***Гастэлы*** (13), ***Дурагіна***, ***Іваненкі***, ***Камарова***, ***Камыніна***, ***Катаева*** (5), ***Лявухіна***, ***Малініна*** (3), ***Няжнова***, ***Нялідава***, ***Трыфанава*** (2), ***Ціханава***; удзельнікаў партызанскага руху на Беларусі і Гомельшчыне: вул. ***Бельчанкі***, ***Бумажкова*** (5), ***Ветрава***, ***Дзеда Талаша*** (2), ***Дынды***, ***М. Казея***, ***Каўпака***, ***Л. Карастаянавай*** (2), ***В. Харужай*** (3), ***Языковіча*** (3); ураджэнцаў Гомельшчыны, што вызначыліся ў вызваленні яе ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў: вул. ***Басянкова*** (2), ***Г. Дакутовіч***, ***Зайцава*** (8), ***Катлаўца***, ***Катуніна*** (2), ***братоў Лізюковых*** (3), ***Г. Падабедава***, ***Співака***, ***Р. Шаршнёвай***; удзельнікаў падполля: вул. ***Барадзіна***, ***Барыкіна***, ***Громавай***, ***Заслонава*** (20), ***Ісачанкі*** (2), ***Кожара***, ***З. Касмадзям'янскай*** (4), ***А. Кашавога*** (5). У адзначаным тыпе матывацыі гэта самая шматлікая група. Многія з найменняў не паўтараюцца і характэрны для урбананіміі населеных пунктаў раёнаў ці саміх раённых цэнтраў (такіх онімаў 211, што называюць 259 аб'ектаў, – вуліц і завулкаў побач).

У аснове трэцяй падгрупы знаходзяцца прозвішчы дзеячаў навукі, культуры, мастацтва, герояў мірнага часу: а) самыя распаўсюджаныя гадонімы ў гонар рускіх пісьменнікаў: вул. ***Астроўскага*** (13), ***Беднага***, ***Бялінскага*** (3), ***Гайдара***, ***Гогаля*** (10), ***Горкага*** (25), ***Грыбаедава***, ***Дабралюбава*** (3), ***Дастаеўскага*** (5), ***Караленкі***, ***Крылова*** (4), ***Лермантава*** (13), ***Маякоўскага*** (17), ***Някрасава*** (10), ***Пушкіна*** (26), ***Радзішчава*** (3), ***Суркова***, ***Л. Талстога*** (10), ***Тургенева*** (7), ***Фадзеева***, ***Чарнышэўскага*** (8), ***Чэхава*** (10), ***Ясеніна***; радзей – украінскіх: ***Шаўчэнкі*** (6); б) у гонар беларускіх пісьменнікаў, дзеячаў навукі: вул. ***М. Багдановіча*** (4), ***Багушэвіча***, ***Броўкі*** (2), ***Глебкі***, ***Я. Коласа*** (17), ***Куляшова***, ***Я. Купалы*** (16), ***Лупсякова***, ***Макаёнка***, ***Мележа*** (3), ***А. Міцкевіча***, ***Ф. Скарыны*** (8), ***Сурначова***; в) у гонар дзеячаў савецкай і сусветнай навукі: вул. ***Каралёва*** (5), ***Курчатава***, ***Ламаносава*** (7), ***Лепяшынскага*** (2), ***Макаранкі*** (3), ***Мендзялеева***, ***Мечнікава*** , ***Мічурына*** (13), ***Паўлава*** (2), ***Пірагова*** (2), ***Сухога*** (1), ***Ціміразева*** (6), ***Цыялкоўскага***; г) у гонар лётчыкаў-выпрабавальнікаў, касманаўтаў, палярнікаў: вул. ***П. Асіпенкі***, ***Берагавога*** (3), ***Быкоўскага***, ***Гагарына*** (32), ***Дабралюбава***, ***Камарова*** (2), ***Клімука***, ***Нікалаева*** (3), ***Церашковай*** (4), ***Цітова*** (5), ***Чалюскіна***,

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

***Чкалава*** (20); д) назвы ў гонар работнікаў міліцыі, пажарнікаў, якія загінулі пры выкананні службовых абавязкаў: вул. ***Агарэнкі***, ***Ігнаценкі***, ***Кібенка***, ***Малайчука*** (2), ***Марціновіча***, ***Царэнкі***, ***Чачына***. Зафіксаваны адзінкавыя гадонімы, матывавальнай асновай якіх з'яўляюцца прозвішчы рускіх кампазітараў, мастакоў: вул. ***Глінкі*** (2), ***Рэпіна***, ***Чайкоўскага*** (2).

Найменні, што ўтварыліся па формуле – матыў *у гонар знакамітых людзей*, узніклі, паводле даследаванняў Г.М. Мезенкі, у XVI ст. і пашырыліся ў XX ст. [6, с. 115]. Амаль усе старажытныя гадонімы былі перайменаваны, некаторыя існуюць у якасці неафіцыйных. На Гомельшчыне са старых онімаў гэтага тыпу захавалася толькі некалькі: ***Антонаўка*** (як неафіцыйная назва ад імя кіраўніка папяровай фабрыкі ў г. Добруш Антона Стружынскага), ***Бухонкі*** (Ілья Адамавіч Бухонка першы стаў за станок папяровай фабрыкі, працаваў на ёй усё жыццё, падчас пажару выратаваў станкі і паперу), ***Ірынінская*** (у гонар апошняй уладальніцы Гомеля княгіні Ірыны Паскевіч, вуліца таксама была ў савецкі час перайменавана, і толькі нядаўна ёй вярнулі былую назву), ***Фёдараўка***, ***Шчарбакоўка*** (ад прозвішчаў іх заснавальнікаў, г. Добруш).

Шырокімі магчымасцямі ва ўтварэнні гадонімаў валодаюць і айконімы (95 : 203). У адзначаным тыпе вылучана некалькі груп.

Найбольш актыўна выступае група, матываваная ў асноўным назвамі сельскіх населеных пунктаў, у накірунку якіх размешчаны лінейныя аб'екты: вул. ***Букчанская***, ***Дварэцкая***, ***Зябраўская***, ***Іскраўская***, ***Клёнкаўская***, ***Муляраўская***, ***Міхалкаўская***, ***Прыбарская***, ***Рычаўская***, ***Сеўрукоўская***, ***Сізаны***, ***Цэрахоўская***, ***Чонкаўская***, ***Чырвонабярэжская***, ***Юравіцкая*** і інш. Гэтая прыкмета характэрна для абласнога горада, раённых цэнтраў і паселішчаў сельскага тыпу.

Некаторыя населеныя пункты з цягам часу ўвайшлі ў прыгарадную зону ці мяжу гарадоў або буйных вёсак, аднак іх найменні захаваліся (урбанізаваліся): ***Брылёўская***, ***Вірская***, ***Давыдаўская***, ***Ласкавая*** (былая в.***Ласка***), ***Любенская***, ***Мільчанская***, ***Рудабельская***, ***Чэхі*** і інш. Гадонімы названых груп не паўтараюцца і толькі адзінкавыя пераходзяць на аб'екты меншых памераў (завулкі, праезды, тупікі): вул. ***Беражэцкая***, зав. ***Беражэцкі***, вул. ***Мільчанская***, пр-зд ***Мільчанскі***. 3) Для намінацыі выкарыстоўваюцца і назвы беларускіх гарадоў: вул. ***Аршанская***, ***Бабруйская*** (4), ***Брэсцкая*** (3), ***Быхаўская***, ***Веткаўская*** (2), ***Віцебская*** (3), ***Гомельская*** (15), ***Гродзенская*** (3), ***Добрушская*** (3), ***Доўская***, ***Ельская***, ***Жлобінская***, ***Калінкавіцкая***, ***Лельчыцкая*** (2), ***Магілёўская*** (3), ***Мазырская*** (5), ***Мінская*** (8), ***Пінская*** (2), ***Полацкая***, ***Рагачоўская*** (4), ***Рэчыцкая*** (4), ***Салігорская*** (5). Найменні гарадоў рэспублік, што ўваходзілі ў склад былога Савецкага Саюза, задзейнічаны ў матывацыі радзей: вул. ***Адэская*** (2), ***Бранская***, ***Валгаградская*** (2), ***Кастрамы***, ***Кіеўская*** (6), ***Ленінградская*** (4), ***Маскоўская*** (6), ***Падольская*** (2), ***Севастопальская*** (6), ***Чарнігаўская*** (2), ***Яраслаўская*** (2). У аснове ўтварэнняў ад назваў гарадоў знаходзіцца некалькі матываў: указваюць накірунак, у бок якога вядуць гадонімы, выступаюць як сімвал дружбы і добрых суседскіх адносінаў. Апошні матыў стаў базай для ўзнікнення пакуль што адзінкавых гадонімаў у гонар гарадоў-пабрацімаў (вул. ***Клермон-Феран***).

Гомельшчына значна пацярпела ад вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Тэрыторыя 7 раёнаў аказалася ў зоне забруджання радыёнуклідамі, і насельніцтва вымушана было адсяліцца на новае месца жыхарства. Гэты фактар фарміруе новую групу гадонімаў, што названы адсяленымі жыхарамі ў гонар сваіх родных мясцін: вул. ***Белы Бераг*** (в. Скрыгалаў Мазырскага р-на, ад аднайменнай адселенай вёскі), ***Нараўлянская*** (г.п. Акцябрскі), ***Чачэрская*** (г. Гомель).

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Прадуктыўнасцю вызначаецца тып, матываваны ідэонімамі (35 : 213). Лінейныя аб'екты гэтага тыпу падпарадкоўваюцца матывацыйнай формуле – *у гонар свят*. Онімы фіксуюць важныя гістарычныя падзеі, знамянальныя даты былога СССР і нашай рэспублікі, таму іх адносяць да назваў-мемарыялаў. Унутры тыпу выразна заявілі аб сабе 4 групы: а) гадонімы матывуюцца найменнямі свят, звязаных з перамогай Кастрычніцкай рэвалюцыі. Свята 1-е Мая ўвасоблена ў гадонімах вул. ***1 Мая***, ***Першамайская*** (52), свята Кастрычніка – вул. ***Кастрычніцкая*** (43); ***8 Сакавіка*** (16), ***17 Верасня*** (2), ***11 Ліпеня***; б) у другой паводле прадуктыўнасці групе адлюстраваны юбілеі гістарычных падзей і свят: утварэння БССР і СССР: вул. ***30 год БССР*** (2), ***40 год БССР*** (4), ***50 год БССР*** (2), ***60 год БССР*** (3), ***70 год БССР***; ***50 год СССР*** (3); перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі: вул. ***10 год Кастрычніка*** (2), ***16 год Кастрычніка***, ***30 год Кастрычніка***, ***40 год Кастрычніка*** (3), ***50 год Кастрычніка*** (5), ***60 год Кастрычніка*** (8); свята Перамогі: вул. ***30 год Перамогі*** (2), ***40 год Перамогі*** (5). Асобна вылучаюцца гадонімы, намінацыяй якіх паслужылі юбілеі арганізацый і прадпрыемстваў: вул. ***50 год УЛКСМ***, ***50 год ЛКСМБ*** (2), ***30 год Савецкай Арміі***; ***50 год з-да Гомсельмаш***, ***50 год шклозавода***; в) трэцяя група аб'ядноўвае найменні ў гонар свят, звязаных з перамогай народа ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі: вул. ***9 Мая*** (7), ***Перамогі*** (24), ***3 Верасня*** (дзень вызвалення Жлобіна) (1), ***18 Лістапада*** (дзень вызвалення Рэчыцы). Адзінкавыя онімы сведчаць пра дасягненні ў галіне касманаўтыкі (вул. ***12 красавіка***); г) утварэнні ад назваў свят у краінах старога свету: вул . ***Парыжскай Камуны*** (у гонар першай у гісторыі пралетарскай рэвалюцыі) (7). Назвы рэлігійных свят рэпрэзентаваны ў гаданіміі на тэрыторыі Гомельшчыны адным дэрыватам (вул. ***Калядная***, г. Буда-Кашалёва).

Зрэдку гадонімы матывуюцца назвамі легендарных крэйсераў, арганізацый: вул. ***Аўроры***, ***Мапроўская***, ***III Інтэрнацыянала***.

Для адурбананімічных гадонімаў характэрны ўтварэнні з "часавым значэннем". Новым забудовам звычайна даваліся імёны аб'ектаў, што знаходзіліся побач або непадалёку: вул. ***Карпілаўская – Новакарпілаўская***, ***Палеская – Новапалеская***. Гэта прыводзіла да ўтварэння трайных або бінарных пазіцый у адным населеным пункце: вул. ***Чарнігаўская – Старачарнігаўская – Новачарнігаўская***, ***Быхаўская – Старабыхаўская*** (г. Гомель). Такія найменні з цягам часу страцілі свой першапачатковы сэнс. Лінейныя аб'екты малых памераў (завулкі, тупікі, праезды) таксама ў цэлым носяць імёны бліжэйшых вуліц і ствараюць з'яву "люстраной урбананіміі": вул. ***Новапрудкоўская*** – зав. ***Новапрудкоўскі*** – пр-зд ***Новапрудкоўскі***, вул. ***Старачарнігаўская*** – зав. ***Старачарнігаўскі***, вул. ***Чонкаўская*** – зав. ***Чонкаўскі*** (г. Гомель). Іншыя ўтварэнні ад саміх урбанонімаў адзінкавыя: вул. ***Чырвоная Плошча*** (2).

Гідронімы не займаюць актыўную пазіцыю ў намінацыі лінейных онімаў (8 : 23) і задзейнічаны ў асноўным у гаданіміі населеных пунктаў, размешчаных на берагах рэк: м-н ***Беразіна***, вул. ***Дняпроўская*** (7), ***Друцкая*** (5), ***Прыпяцкая*** (3), ***Сожская***. Такія аб'екты сведчаць аб іх знаходжанні паблізу набярэжных рэк ці ў кірунку да рэк. У асобных выпадках ужыты матыў *у гонар* буйных рэк, мораў: вул. ***Прыпяцкая*** (г. Светлагорск, сам знаходзіцца на Бярэзіне, правым прытоку Дняпра), ***Амурская*** (2), ***Балтыйская***, ***Чарнаморская*** ці асноўных рэк, куды ўліваюцца прытокі, на якіх узнік айконім: вул. ***Дняпроўская*** (г. Гомель, знаходзіцца на беразе Сажа, левага прытока Дняпра).

Гадонімы Гомельшчыны рэпрэзентаваны і харонімамі (3 : 30): вул. ***Беларуская*** (11), ***Палеская*** (18), ***Украінская***.

Зафіксаваны адзінкавыя выпадкі выкарыстання ў якасці матыватара этнонімаў: вул. ***Славянская*** (2).

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Гадонімы адапелятыўнага паходжання (288 : 1507) характарызуюцца выкарыстаннем у якасці ўтваральных асноў розных лексіка-тэматычных пластоў. Значная група іх уключае найменні адцягненай семантыкі, што абазначае “сімвалы савецкай эпохі” [6, с. 135], ці назвы-мемарыялы: вул. ***Адраджэння***, ***Брацкая***, ***Грамадзянская*** (3), ***Дружбы*** (5), ***Інтэрнацыянальная*** (30), ***Кааператыўная*** (17), ***Калгасная*** (40), ***Камсамольская*** (45), ***Камуністычная*** (13), ***Касмічная*** (2), ***Культуры***, ***Маладосці***, ***Маладзёжная*** (55), ***Мірная*** (3), ***Міру*** (29), ***Надзеі***, ***Народная***, ***Піянерская*** (33), ***Пралетарская*** (33), ***Праўды***, ***Працоўная*** (24), ***Рабочая*** (26), ***Радасці***, ***Ракетная***, ***Рэвалюцыйная*** (11), ***Савецкая*** (83), ***Саўгасная*** (9), ***Сацыялізма***, ***Сацыялістычная*** (12), ***Свабоды*** (5), ***Сялянская*** (17), ***Ураджайная*** (6), ***Чырвоная*** (3), ***Энтузіястаў***, ***Юбілейная*** (29), ***Юнатаў*** (48 : 582). Прыклады сведчаць, што многія з іх прысутнічаюць ва урбаніміконе амаль кожнага населенага пункта.

Назвы лінейных аб’ектаў Гомельшчыны звязаны з чатырма відамі транспартных сродкаў (72 : 265). Асабліва прадуктыўна задзейнічана лексіка чыгуначнага транспарту: вул. ***Вакзальная*** (16), ***Дэпоўская*** (2), ***Лакаматыўная*** (2), ***Пуцявая*** (3), ***Сарціровачная*** (2), ***Станцыйная*** (6), ***Таварная*** (2), ***Чыгуначная*** (17). Паняцці паветранага і аўтамабільнага транспарту фіксуюць онімы: вул. ***Авіяцыйная*** (6), ***Аэрадромная***, ***Шасейная*** (9). Гарадскі пасажырскі транспарт прадстаўлены найменнямі вул. ***Тралейбусная 2***, ***Тралейбусны*** завулак.

Група гадонімаў сведчыць пра знаходжанне побач ці непасрэдна на іх: а) прамысловых аб’ектаў: вул. ***Гомсельмашаўская***, ***Дрэваапрацоўчая***, ***Заводская*** (27), ***Камбайнавая***, ***Крысталаўская***, ***Ліцейная*** (2), ***Машынабудаўнічая***, ***Мебельная***, ***Суднабудаўнічая***, ***Трактарная***, ***Фабрычная*** (6), ***Элеватарнага спуску***, зав. ***Ільнозаводскі***, ***Швейны***, ***Станкабудаўнічы*** пр-зд; б) навучальных устаноў: вул. ***Універсітэцкая***, ***Школьная*** (42); в) разнастайных служб: вул. ***Абсерваторная***, ***Арцельная***, ***Банная Алея***, ***Гаражная***, ***Гаспадарчая Алея***, ***Камбінацкая***, ***Камунальная*** (15), ***Паштовая*** (4), ***Сувязі***, ***Пажарны*** зав.; г) медыцынскіх устаноў: вул. ***Медыцынская***, ***Санаторная***, ***Шпітальная***, зав. ***Амбулаторны***, ***Бальнічны*** (3); д) спартыўных комплексаў і мерапрыемстваў: вул. ***Алімпійская*** (3), ***Спартыўная*** (8), ***Стадыённая*** (5), ***Фізкультурная*** (2).

У аснове онімаў знаходзіцца характарыстыка прыродных асаблівасцей мясцовасці, на якой ці каля якой будаваліся, сяліліся людзі (17 : 145). Адзначаная група матывуецца наменклатурнымі фізіка-геаграфічнымі тэрмінамі, што абазначаюць: а) прыродныя або штучныя вадаёмы: вул. ***Азёрная*** (12), ***Балотная***, ***Крынічная*** (3), ***Лугавая*** (30), ***Паплаўская*** (ад *поплаў*) (2), ***Рачная*** (10); б) указваюць на блізкае месцазнаходжанне каля іх лінейных аб’ектаў: вул. ***Берагавая*** (2), ***Набярэжная*** (28), ***Правабярэжная***, зав. ***Набярэжны*** (4); в) утвораны ад назваў рэльефу ўзвышаных і адкрытых роўных месц: вул. ***Гара Камунараў***, ***Горная***, ***Ленінскае Падгор’е***, ***Нагорная*** (4), ***Палявая*** (31), ***Цалінная***, зав. ***Палявы*** (8); характарызуюць навакольную глебу: вул. ***Пясочная*** (4), зав. ***Пясочны***, пр-зд ***Пясочны*** (2).

Вялікая група назваў сведчыць пра месцазнаходжанне гадонімаў і іх арыентацыю на мясцовасці адносна якіх-небудзь іншых аб’ектаў (28 : 133): вул. ***Верхняя***, ***Высокая***, ***Дальняя***, ***Далёкая***, ***Канцавая***, ***Ніжняя***, ***Сярэдняя***, ***Цэнтральная*** (13); ***Заазёрная*** (2), ***Залінейная*** (6), ***Зарэчная*** (18), ***Падгорная*** (6), ***Падлесная*** (2), ***Прыазёрная*** (4), ***Прывакзальная*** (5), ***Прыгарадная*** (6), ***Прыдарожная***, пл. ***Прымаставая*** або звязаны з напрамкамі свету: вул. ***Заходняя*** (6), ***Паўднёвая*** (7), ***Паўночная*** (9), ***Усходняя*** (8), зав. ***Заходні*** (7), ***Паўднёвы*** (5), ***Паўночны*** (2), ***Усходні*** (4).

У адапелятыўных утварэннях выдзяляюцца гадонімы фларыстычнага паходжання: а) ад агульных назваў лясных масіваў, кустоўя, травяністых раслін:

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

вул. ***Баравая***, ***Баравіца***, ***Вялікая Садовая***, ***Кветкавая*** (8), ***Лесапаркавая***, ***Лясная*** (17), ***Паркавая*** (10), ***Рошчынская*** (2), ***Садовая*** (32), ***Ягадная***, зав. ***Лясны*** (6), ***Садовы*** (7); б) адзінкавыя ў асноўным онімы прадстаўлены назвамі канкрэтных відаў драўнінных парод, кустоўя, травяністых раслін: вул. ***Альховая***, ***Бэзавая***, ***Бярозавая*** (4), ***Верасковая***, ***Вінаградная***, ***Вішнёвая*** (8), ***Гваздзіковая***, ***Каштанаўская***, ***Кляновая***, ***Ліпавая***, ***Малінавая***, ***1-я Мохавая***, ***Сасновая*** (7), ***Сунічная***, зав. ***Мурожны***, ***Ракітавы***, ***Сасновы*** (3). 28 такіх назваў намінуюць 124 аб'екты.

Нямала лінейных аб'ектаў утворана ад лексем ваеннай тэматыкі (20 : 79), якія сведчаць пра найменні родаў войск і падраздзяленняў: вул. ***Апалчэнцаў***, ***Артылерыйская*** (2), ***Арудзійная*** (4), ***Афіцэрская***, ***Гвардзейская***, ***Зенітчыкаў*** , ***Камуністычнай Роты***, ***Партызанская*** (20), ***Чырвонаармейская*** (23), пл. ***Танкістаў***. З назвамі прафесій, родам дзейнасці людзей звязаны наступныя гадонімы: вул. ***Будаўнікоў*** (8), ***Воднікаў***, ***Геолагаў*** (4), ***Інжынерная***, ***Касманаўтаў*** (13), ***Меліяратараў***, ***Метызнікаў***, ***Механізатараў***, ***Нафтавікоў*** (3), ***Энергетыкаў*** (6) (18 : 79).

У онімах адлюстравана і функцыянальная нагрузка аб'ектаў: вул. ***Аб'яздная***, ***Выгонная***, ***Гандлёвая***, ***Дачная*** (2), ***Кальцавая*** (2), ***Пад'ездная***, ***1-я Праезжая***, ***Сянная*** (2) (гандлявалі сенам), ***Транспартная*** (9:35).

У назвах зафіксаваны асаблівасці аб'ектаў, што ствараюць аб іх агульнае ўражанне: вул. ***Ветраная***, ***Малая***, ***Паўкруглая***, ***Прамая***, ***Роўная***, ***Светлая*** (6), ***Сонечная*** (15), ***Ціхая***, ***Цяністая*** (2), ***Шырокая*** (15:37).

Непрадуктыўныя групы, якія ўказваюць на адносны час узнікнення, існавання аб'ектаў: вул. ***Новая*** (24), ***Новая Заходняя***, ***Новы Пасёлак***, ***Новы Праспект***, ***Новы Свет***, зав. ***Новы*** (2); утрымліваюць значэнне колеру: вул. ***Бірузовая***, ***Жамчужная***, ***Лазурная*** (2), ***Зялёная*** (10), зав. ***Зялёны*** (2); матывуюцца порамі года: вул. ***Асенняя***, ***Вясенняя*** (2).

Такім чынам, ва ўтварэнні урбанонімаў задзейнічаны 2 пласты лексікі: апелятывы і анамастычныя класы (а гэта іх аб'ядноўвае з айконімамі і гідронімамі), аднак маюцца і свае адметнасці. У сістэме акрэсленых намінантаў найбольш прадуктыўна прадстаўлены гадонімы аданамастычнага паходжання, матываваныя сямю класамі: антрапонімамі, айконімамі, урбанонімамі, ідэонімамі, гідронімамі, харонімамі, этнонімамі. Самыя шматлікія групы ва урбананіміконе гэтай падсістэмы ўтвораны паводле мадэлі *у гонар* уласнага імя чалавека, паселішча, свята.

Гадонімы адапелятыўнага паходжання складаюць 9 тыпаў з іх унутранымі разнавіднасцямі. Перавага аддадзена лексіцы адцягненага мемарыяльнага характару, якая мае вагу і ў айканіміі, але не сустракаецца ў гідраніміі. Спосабы намінацыі ў параўнанні з айконімамі і гідронімамі рэпрэзентаваны абмежаванымі групамі лексем. Многія з урбананімічных назваў маюць высокую частотнасць, рэалізуюцца ў гаданіміконе амаль кожнага населенага пункта. Склад утваральных асноў онімаў у цэлым агульны для ўсіх тыпаў пасяленняў, аднак ёсць і асобныя, характэрныя для асціёнімаў (назваў паселішчаў гарадскога тыпу) і камонімаў (назваў паселішчаў сельскага тыпу).

*ЛІТАРАТУРА*

1. ***Багамольнікава, Н.А.*** Гідронімы басейна ракі Прыпяць: структурна-семантычныя тыпы матывацыі / Н.А. Багамольнікава. – Гомель: ГДУ, 2004. – 195 с.
2. ***Гуліцкая, В.А.*** Семантычная матывацыя урбонімаў Гомеля / В.А. Гуліцкая, Н.А. Старасценка // Беларуская мова: міжвед. зб. – Мн.: Універсітэцкае, 1989. – Вып. 17. – С. 38-43.
3. ***Жучкевич, В.А.*** Улицы помнят: История, события, люди в названиях улиц и площадей города-героя Минска / В.А. Жучкевич. – Мн., 1979. – 185 с.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

4. ***Лемцюгова, В.П.*** Беларуская айканімія. Лінгвістычны аналіз населеных пунктаў Мінскай вобласці / В.П. Лемцюгова. – Мн.: Навука і тэхніка, 1970. – 155 с.
5. ***Мезенка, Г.М.*** Структурна-граматычныя тыпы урбонімаў Віцебска 1838 і 1889 гг. / Г.М. Мезенка // Беларуская мова: міжвед. зб. – Мн.: Універсітэцкае, 1987. – Вып. 15. – С. 138-142.
6. ***Мезенко, А.М.*** Урбанонимия Белорусии / А.М. Мезенко. – Мн.: Университетское, 1991. – 166 с.
7. ***Мезенка, Г.М.*** Беларуская анамастыка / Г.М. Мезенка. – Мн.: Вышэйшая школа, 1997. – 119 с.
8. ***Мезенко, А.М.*** Имя внутригородского объекта в истории. Об урбанонимах Беларуси XIV – нач. XX в. / А.М. Мезенко. – Мн.: Вышэйшая школа, 2003.

Паступіў у рэдакцыю 15.11.2005.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова